***У Оршы на гэтым тыдні сталі вядомы вынікі абласнога конкурсу «Песні юнацтва нашых бацькоў».***

Традыцыйнае творчае спаборніцтва ў гэтым годзе сабрала тры групы і 18 лепшых вакалістаў з усёй Віцебшчыны. Навапалацк прадстаўлялі вакальна-харавая студыя «Інвента», Ангеліна Мурашкевіч з Полацкага дзяржуніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай, саліст Цэнтра культуры Уладзіслаў Жудранок, а таксама пачынаючая спявачка Анастасія Светлая. Аднак паспяхова фінал склаўся толькі для двух талентаў з нашага горада. Уладзіслаў стаў уладальнікам дыплома лаўрэата III ступені, Ангеліна – II. У якасці заахвочвання прызёры былі адзначаны каштоўнымі падарункамі.



***Уладзіслаў Жудранок***